Источник: "Звязда" - 2020-05-19

№ 8 (251)

# УНІЗ ПА РАЦЭ

## Куды ганялі плыты нашы продкі?

**З XVI да XIX стагоддзя па паўнаводных рэках Беларусі выпраўляліся караваны з плытоў. Наш лес быў запатрабаваны ў Еўропе. Гандлярам даводзілася прытрымлівацца даволі жорсткіх стандартаў. Напрыклад, брусы англійскія ці галандскія мусілі быць пэўнай даўжыні і дыяметра. Нізкагатунковы тавар маглі альбо наогул не прыняць ці даць за яго малыя грошы. Гандаль лесам (сплаўлялі бярвёны, брусы, спецыяльна падагнаную клёпку) быў наладжаны на высокім узроўні. Сплаўлялася вельмі вялікая колькасць матэрыялаў. Напрыклад, англічане так добра пагаспадарылі на Прыпяці, што засталася назва дубовага бруса, а некаторых беларускіх дуброў не стала.**



Адзін з аўтараў-укладальнікаў кнігі «Плытніцтва: тэматычны слоўнік» і навуковы рэдактар працы, загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Вераніка КУРЦОВА.

### Расшыфруем верш класіка?

Натуральна, прафесія плытагона была добра знаёма беларусам. Перагонка плыта па Нёмане магла займаць ад чатырох да дзевяці тыдняў. Заробак быў у 35 рублёў. Калі ўлічыць тагачасныя цэны, дык на зарплату плытагона можна было купіць каля 100 кілаграмаў ялавічыны. Здаецца, нямала, але за страчаныя ў дарозе бярвенні можна было пазбавіцца гэтага прыбытку. На такія экстрэмальныя заробкі людзей падбіваў голад і галеча — усё ж хлеб гэты быў надта цяжкі. Лес сплаўлялі ранняй вясной, цэлымі днямі плытнікі знаходзіліся на адкрытым паветры. Мерзлі, моклі пад дажджамі, саслізгвалі з бярвенняў у ледзяную ваду. Многія з іх атрымлівалі хваробы, у тым ліку такія, ад якіх пасля маглі пакутаваць доўгія гады. Да таго ж справа гэта была небяспечная. Даводзілася праходзіць крутыя павароты, парогі, камяні, што выступалі з вады. Такі занятак патрабаваў досведу, спрыту, кемлівасці, вытрымкі, мужнасці. Ці не адлюстраванне гэта найлепшых якасцяў характару беларусаў? Усё, што звязана з плытніцтвам, стала нашым агульнакультурным набыткам. Не меншую каштоўнасць уяўляе сабой лексіка, якая адлюстравала гэты вельмі цяжкі занятак.

Прачытайце верш «Плытнікі» Якуба Коласа, дзе ён апісаў занятак, якім займаліся блізкія яму людзі. Сёння многія са слоў, якія выкарыстаў класік, нам здаюцца незразумелымі, але гэта лёгка выправіць. Дастаткова звярнуцца да тэматычнага слоўніка «Плытніцтва», які пабачыў свет дзякуючы намаганням супрацоўнікаў аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Гэта першы і адзіны ў нацыянальнай мовазнаўчай навуцы слоўнік, дзе сістэматызаваны лексічныя матэрыялы, прысвечаныя адыходнаму неземляробчаму промыслу беларусаў.

### Гартоль, саха, арала...

Вучоныя Інстытута мовазнаўства вельмі многа робяць для захавання не толькі мовы, але і інфармацыі пра жыццё, занняткі, назіранні нашых продкаў. Так, з папярэдніх тэматычных слоўнікаў мы можам даведацца пра сельскую гаспадарку, жывёльны і раслінны свет. Але адна справа — збіраць словы, звязаныя з традыцыйным побытам і рэаліямі, што існуюць у наш час, і зусім іншая — інфармацыю аб промысле, які ўжо знік, — з развіццём чыгункі ў XIX стагоддзі плытніцтва перастала быць запатрабаваным, хоць плыты яшчэ працягвалі ганяць ажно да сярэдзіны мінулага стагоддзя.

«Слоўная спадчына — унікальная, спецыфічная. Не паспелі сёння знайсці чалавека, які растлумачыць паняцце, заўтра можа быць позна — страціцца слова, а з ім і культурны феномен, які гэта слова прэзентавала. І гэта страта будзе незваротнай, — заўважыла рэцэнзент выдання, **доктар філалагічных навук, прафесар Ірына ГАПОНЕНКА.** — Такую спадчыну трэба збіраць і абараняць менавіта цяпер. Праца, якую праводзіць Інстытут мовазнаўства па зборы, упарадкаванні, сістэматызацыі матэрыялу, можа лічыцца найактуальнейшай, а вынікі яе — адным з найважнейшых дасягненняў айчыннай і ўвогуле славянскай лінгвістыкі. Многія лексемы, якія ўвайшлі ў зборнік «Плытніцтва», упершыню ўведзены ў навуковы зварот, іх можна прыраўноўваць да лінгвістычных адкрыццяў».

У слоўнік уключаны лексічныя матэрыялы, якія збіраліся з тэрыторыі басейнаў асноўных буйных рэк Беларусі. І нашу краіну раней можна было нават называць плытніцкай дзяржавай: настолькі быў распаўсюджаны гэты занятак.

У асноўным моўныя адзінкі, звязаныя з плытніцтвам, занатоўваліся падчас абследавання населеных пунктаў пры рабоце над такімі буйнымі выданнямі, як «Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча», «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак», «Агульнаславянскі лексічны атлас». Гэта экспедыцыі 60—70-х і сярэдзіны 80-х гадоў XX стагоддзя.

Уражвае ахоп крыніц, якія вывучаліся пры падрыхтоўцы выдання: ад геаграфіі і статыстыкі XIX стагоддзя, архіўных звестак, матэрыялаў, сабраных дыялектолагамі і этнографамі, да сучасных палявых збораў. Нават цяжка ўявіць, колькі намаганняў прыйшлося прыкласці невялікаму аўтарскаму калектыву, каб упарадкаваць сабраны матэрыял і даць дэфініцыю кожнаму слову. Ну як вызначыць, для чаго выкарыстоўвалі арала, гартоль, саху, барбару? Чым адрозніваецца шархавіна, рамжына, паклеса ад жорасці? Дзе вязалі плыт гужбой, гальвай, клібай, швараі, шырхоўкай і іншай прывяззю? Дзе плылі ганкі, глейні, лавы, грабёнкі, пасы, таркі?

Новае выданне «Плытніцтва» паказвае адметны пласт беларускай вытворчай культуры. З кнігі можна даведацца, як называліся плыты, іх звёны і іншыя часткі, прыстасаванні і сродкі для звязвання бярвёнаў у плыт і цэлыя караваны (яны маглі быць з дзясяткаў звёнаў). Пры дапамозе якіх прылад кіравалі, тармазілі, адпіхваліся, прычальвалі. Як звалі работнікаў, што ганялі плыты, якія былі абавязкі ў галаўніка, штырніка, тарнавога, задніка, корніка, цальніка, дубовіка, шульмана, маладца.



Выданні Інстытута мовазнаўства.

Дзе плытагоны маглі схавацца ў непагадзь, якія назвы давалі небяспечным месцам на рацэ. Вы пабываеце і на румах — месцах, куды звозіўся нарыхтаваны лес і атрымаеце ўяўленне, якія былі віды сплаўнога матэрыялу.

Слоўнік падкажа, з якіх моў прыйшлі запазычанні, звязаныя з гандлем лесам. Дарэчы, такія моўныя кантакты таксама сведчаць пра багатыя эканамічныя адносіны з Захадам.

Выданне заслугоўвае ўвагі розных спецыялістаў: не толькі лінгвістаў, але і этнографаў, гісторыкаў, людзей, якія займаюцца эканомікай.



Плыты маглі быць з некалькіх звёнаў.

Алена Дзядзюля. Уніз па рацэ